# ЛЮДЗІ, ЭКАНОМІКА І ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

## Гэтыя арыенціры ў рабоце акрэсліў Прэзідэнт, прымаючы кадравыя рашэнні

**Сярод учарашніх кадравых пытанняў — узгадненне 12 кандыдатур на пасады кіраўнікоў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.**

На пасаду першага намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама ўзгоднена кандыдатура Ігара Часнака, на пасаду намесніка Гродзенскага аблвыканкама — Віктара Пранюка.

Ігар Марковіч узначаліць Полацкі райвыканкам, Васіль Шылаў — Верхнядзвінскі, Алег Лындзін — Талачынскі, Сяргей Дылюк — Нараўлянскі, Генадзь Шатуеў — Карэліцкі, Уладзіслаў Гершгорын — Ашмянскі, Аляксандр Гарбачэўскі — Касцюковіцкі, Сяргей Шацкі — Крычаўскі. Аляксандр Сівакоў будзе кіраваць адміністрацыяй Чыгуначнага раёна Гомеля, Пётр Салаўёў — Кастрычніцкага раёна Магілёва.

Аляксандр Лукашэнка перш за ўсё падзякаваў прысутным (большасць з іх да гэтага ўзначальвала іншыя рэгіёны) за работу падчас сёлетняй выбарчай кампаніі і за яе вынікі. «Я аддаю вельмі вялікую ўвагу, як вы заўважылі, гэтаму факту, бо гэта паказчык эфектыўнасці работы нашых органаў улады, яе вертыкалі, гэта паказчык стойкасці і мужнасці тых людзей, якія былі задзейнічаны ў гэтых выбарах, — растлумачыў Прэзідэнт. — Але, зноў жа, расслабляцца ні ў якім выпадку нельга. Гэта была рэпетыцыя, асноўная дзея нас чакае наперадзе».

Прэзідэнт дадаў, што размова не пра надзвычайную праверку, але выклікаў для маладой суверэннай дзяржавы сёння шмат, і ніхто зараз дакладна не скажа, што нас чакае наперадзе. «Таму мы заўсёды павінны працаваць па максімуме», — рэзюмаваў ён.

І на першым месцы, па словах кіраўніка дзяржавы, у прадстаўніка ўлады павінны стаяць інтарэсы людзей. «Без падтрымкі людзей мы не вырашым ніводнае пытанне ў будучыні», — папярэдзіў ён.

Што датычыцца выклікаў, то пры пасяховай эканоміцы ніводны з іх для нас не страшны. «А эканоміка залежыць ад нас, ад кіраўнікоў. Будзем эфектыўна кіраваць працэсам, краіна не абваліцца. І мы можам вырашыць любую праблему ў Беларусі», — акцэнтаваў Прэзідэнт.

«Таму — людзі, эканоміка і прафесіяналізм — прыярытэты па ўсіх кірунках, якія будуць уваходзіць у сферу вашай дзейнасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт анансаваў візіт у Віцебскую вобласць пасля навагодніх свят, каб прыняць канчатковае рашэнне па развіцці гэтага рэгіёна. «Упэўнены, ва ўсіх абласцях гэты вопыт будзе запатрабаваны», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы паўтарыў, што зона адказнасці старшынь райвыканкамаў ляжыць, перш за ўсё, у сферы дзейнасці і інтарэсах стратных прадпрыемстваў. За такія гаспадаркі кіраўнікі раёнаў, уключаючы намеснікаў старшыні, адказваюць персанальна.

* * *

Аляксандр Лукашэнка таксама ўзгадніў прызначэнне Анатоля Бубена на пасаду старшыні Беларускага дзяржаўнага канцэрна харчовай прамысловасці «Белдзяржхарчпрам» і Ігара Шустава на пасаду генеральнага дырэктара Адкрытага акцыянернага таварыства «МІНСК КРЫШТАЛЬ» — кіруючая кампанія холдынга «МІНСК КРЫШТАЛЬ ГРУП».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу Анатоля Бубена на важнасць прадухілення карупцыі ў канцэрне і падкрэсліў, што калі ў ёй аказваюцца замешаныя падначаленыя, то цень падае і на кіраўніка.

«Нас чакаюць няпростыя часы ў вашай сферы ў сувязі з тым, што, магчыма, зменіцца структура кіравання галінай, якая вырабляе і прадае моцныя алкагольныя напоі, але мы павінны захаваць найлепшыя якасці (калі на гэта пойдзем) старой нашай сістэмы, — сказаў Прэзідэнт. — Дзяржава ні ў якім разе не можа сысці з гэтай сферы. Крый божа, аслабім кантроль — людзей пачнуць спойваць «палёнай» гарэлкай, і людзі пачнуць гінуць, як у некаторых суседніх дзяржавах».

Выраб і продаж алкаголю і тытуню на рынкавых умовах усё роўна павінны заставацца пад строгім кантролем дзяржавы, упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

* * *

У рабочым парадку на пасаду першага намесніка міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прызначэнне Баляслава Пірштука, на пасаду першага намесніка міністра прамысловасці — Сяргея Гунько; на пасаду начальніка галоўнага ўпраўлення абавязковай юрыдычнай экспертызы нарматыўных прававых актаў Міністэрства юстыцыі — Наталлю Філіпаву; на пасаду старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Брэсцкай вобласці — Аксану Цылько; на пасаду генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі — Дзмітрыя Комлача; на пасаду члена Віцебскага аблвыканкама — Вячаслава Хрола.

Кіраўнік дзяржавы прызначыў Сяргея Цярэнцьева, які ўзначальвае дыпламатычную місію Беларусі ў Егіпце і па сумяшчальніцтве — у Судане і Султанаце Аман, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Алжырскай Народнай Дэмакратычнай Рэспубліцы па сумяшчальніцтве. На пасаду Генеральнага консула Беларусі ў Шанхаі Прэзідэнт узгадніў кандыдатуру Андрэя Андрэева. На пасаду Пастаяннага паўнамоцнага прадстаўніка Беларусі пры статутных органах Садружнасці Незалежных Дзяржаў прызначана Марына Даўгаполава.

* * *

Напярэдадні каталіцкага Раства, 24 снежня, Прэзідэнт прыняў рашэнне па кадравых пераменах у МУС. На пасаду афіцыйнага прадстаўніка МУС у пасольстве Беларусі ва Украіне і па сумяшчальніцтве ў Малдове Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў кандыдатуру генерал-маёра міліцыі Мікалая Мельчанкі.

На пасаду намесніка міністра ўнутраных спраў — начальніка міліцыі грамадскай бяспекі прызначаны генерал-маёр міліцыі Аляксандр Барсукоў. На пасаду намесніка міністра ўнутраных спраў — генерал-маёр міліцыі Сяргей Хаменка.

У той жа дзень Прэзідэнт вызваліў Андрэя Стралецкага ад пасады намесніка кіраўніка спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# У ДОБРАЙ СПАРТЫЎНАЙ ФОРМЕ

## Прэзідэнту прадэманстравалі ўзоры касцюмаў беларускіх атлетаў на Алімпіядзе-2020



Фота БелТА.

**Камплекты распрацоўвалі беларускія кампаніі «Сола-Пінск» і «Світанак», а прадэманстравалі вопратку сярэбраны прызёр Алімпіяды гімнастка Ксенія Санковіч і двухразовая алімпійская віцэ-чэмпіёнка плыўчыха Аляксандра Герасіменя.**

«Я скажу, што будзе попыт на гэту форму», — азнаёміўся з касцюмамі Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнту спадабаліся ўсе ўзоры формы, аднак канчатковае рашэнне прынята не было: дaручана вывучыць меркаванне грамадскасці, у першую чаргу саміх атлетаў. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што форма павінна быць зручнай, а тканіна — якаснай. Кіраўнік дзяржавы таксама лічыць важным, каб беларуская форма была запатрабавана ў аматараў спорту і пасля Алімпіяды.

«Калі будзе тканіна добрая, фарба нармальная, то будуць з задавальненнем купляць», — упэўнены ён. Аляксандру Лукашэнку расказалі, што цяпер беларускія вытворцы абмяркоўваюць стварэнне нацыянальнага брэнда спартыўнага адзення. Прэзідэнту спадабалася гэта ідэя.

Самі спартсменкі ў першую чаргу звяртаюць увагу на функцыянал касцюмаў і якасць тканіны.

«Тут новы класічны дызайн, які вылучае нас, яго можна пазнаць здалёк. Па тканіне ў нас пытанняў не было, яна вельмі лёгкая, свабодная, дыхае. Нічога лепшага, мне здаецца, прыдумаць у Токіа немагчыма», — сказала журналістам Аляксандра Герасіменя. Ксеніі Санковіч па дызайне больш спадабалася яркая бела-чырвоная калекцыя.

«Яна больш патрыятычная, хоць, напэўна, недзе вельмі смелая», — сказала спартсменка.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# АДКАЗЫ НА ЎСЕ ПЫТАННІ

## Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю галоўнаму рэдактару радыёстанцыі «Эхо Москвы»

**Больш за 140 тысяч праглядаў і некалькі соцень каментарыяў за тры дні на сайце радыёстанцыі. Гэтай размовы чакалі і прадказвалі сенсацыі: інтэрв'ю з Прэзідэнтам Беларусі дагэтуль планавалася на 6 снежня, але было перанесена праз сустрэчу лідараў Беларусі і Расіі 7 снежня ў Сочы.**

Пасля размовы з беларускім Прэзідэнтам галоўны рэдактар «Эхо Москвы» Аляксей Венедыктаў паведаміў журналістам, што ў Расіі рэальна ёсць інфармацыйны голад на беларускую пазіцыю. Выходзіць, цяпер няма: па даных расійскіх аналітыкаў, «Эхо Москвы» — самая цытуемая радыёстанцыя Расіі.

«Адказы свабоднага чалавека, якому не трэба хлусіць і выкручвацца», «А я казаў бы такога «прэзідэнта-дыктатара», як Аляксандр Рыгоравіч), дзякуй «Эхо» за інтэрв'ю», «Нармальна. Як мінімум «бацька» цікавейшы за нашага», — адзначаць пазней слухачы і гледачы ў каментарыях.

«Я атрымаў адказы на ўсе пытанні», — сказаў журналістам Аляксей Венедыктаў. А пытанні былі ў тым ліку і вострыя, і асабістыя. А перш за ўсё, прадказальна, палітычныя. Так, размова зайшла пра інтэграцыю. І, на думку Аляксандра Лукашэнкі, развіццё саюзных адносін не цягне за сабой страту суверэнітэту.

### Інтэграцыя суверэнных дзяржаў

«Суперэчнасці ніякай няма. Мы дзве суверэнныя незалежныя дзяржавы — Беларусь і Расія. Мы зараз прасоўваем тую інтэграцыю, якая ніколькі не прымяншае суверэнітэт ні Расіі, ні Беларусі. Што такое суверэнітэт? Гэта ўлада над тэрыторыяй. У нас ёсць межы, у Расіі ёсць межы, улада ажыццяўляецца ў гэтых межах. І мы ніякім суверэнітэтам не дзелімся. Ні Расія, ні Беларусь», — падкрэсліў беларускі лідар.

Ён упэўнены: нельга забыцца на агульныя карані, якія яднаюць славян. І гэтая роднасць уплывае ў тым ліку на бухгалтэрыю. Напрыклад, на тэрыторыі Беларусі месціцца дзве высокатэхналагічныя ваенныя базы Расіі, за якія яна не плаціць, у той час як Байканур (на тэрыторыі Казахстана) абыходзіцца ў суму каля двухсот мільёнаў долараў.

Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў і навіну пра нібыта стварэнне расійскай базы ваенна-паветраных сіл на беларускай тэрыторыі.

«Навошта гэтая база каля граніц? Авіяцыя ў сучаснай вайне не адыгрывае ніякай ролі. Ніякай. І Пуцін згадзіўся: час падлёту з найбліжэйшай базы да Бабруйска тры хвіліны...» — адказаў Прэзідэнт. Таксама ён паведаміў, што Беларусь закупіць у Расіі дванаццаць самалётаў СУ-30.

### І зноў аб нафце...

Беларускі лідар расказаў падрабязнасці перагавораў з Расіяй па пастаўках нафты і газу. У прыватнасці, па яго перакананні, цана на газ не можа быць 152 долары. Беларусь можа пагадзіцца плаціць па такіх цэнах — але каму ад гэтага лепш?

«Але калі расійскі рынак у 25 мільёнаў тон нафты і 22 мільярды кубоў газу сыдзе кудысьці, не крыўдуйце. Я буду шукаць альтэрнатыву — а яе ўсё роўна трэба шукаць. Рэверс нафты. Праз Польшчу ўзяць саудаўскую ці амерыканскую нафту, па трубе завесці рэверсам. У мяне тры трубы нафтаправода «Дружба», на першым этапе я забіраю адну трубу. І рэверсам пастаўляю на НПЗ і перапрацоўваю. Пойдзе нармальна — забяру рэверсам другую трубу. У вас застанецца адна. Вы пастаўляеце пад 70 мільёнаў тон нафты па гэтых трубах на прэміяльны заходні рынак. Дык навошта вы мяне заганяеце ў рашэнне гэтага пытання такім чынам?» — абазначыў сваю пазіцыю Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы настойвае на тым, каб любыя інтэграцыйныя працэсы ішлі на раўнапраўнай аснове, як, напрыклад, гэта адбываецца ў Еўрапейскім саюзе, дзе роўныя галасы маюць усе краіны, незалежна ад памераў, ступені развіцця эканомікі і іншых фактараў.

«А нам нават не намякаюць, а кажуць: «Мы вялікія, а вы меншыя, значыць, будзе так, як у нас». А я кажу: «Не. Тое, што ў вас лепш, давайце зробім агульным здабыткам. Што ў нас — давайце зробім у Расіі», — адзначыў беларускі лідар.

### ...І смяротным пакаранні

«Вас называюць апошнім дыктатарам Еўропы...» — пачаў чарговае пытанне Аляксей Венедыктаў.

«Не я, ужо не я!» — нават перарваў яго Прэзідэнт, які нібыта заслужыў такое «званне» існаваннем смяротнага пакарання ў краіне.

«Мараторыя не будзе. Таму што не маю права — рэферэндум прыняў гэтае рашэнне. Таму рэферэндум можа толькі адмяніць. Не я яго ўводзіў, яно захавана з тых часоў», — адказаў на пытанне пра смяротнае пакаранне Аляксандр Лукашэнка.

— Усе адмянялі, — заўважыў інтэрв'юер.

— Ну, запытай у Пуціна, задаволены ён ці не, — прапанаваў Прэзідэнт.

— Не, — сам адказаў на такое пытанне Аляксей Венедыктаў. — Але тым не менш мараторый заховаецца.

«Чым вострае пытанне рашаць, лепш яго не чапаць. Хтосьці сыходзіць з гэтага. Я лічу, што смяротнае пакаранне як папярэджанне некаторым падонкам дапамагае трымаць стабільнасць і разабрацца з бандытызмам», — працягнуў Аляксандр Лукашэнка.

«А калі, крый божа, з тваімі роднымі, блізкімі... Як мяняецца меркаванне. І ты ўсё роўна не маеш права гэта жыццё адняць. А хто даў права ім адымаць?» — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што пры самай нязначнай магчымасці злачынцы прыгаворваюцца да пажыццёвага зняволення, якое становіцца яшчэ большым для чалавека.

Амаль за дзве гадзіны суразмоўнікі абмяркавалі і спартыўныя праблемы, і пытанні выхавання маладога пакалення, і пагляды на будучыню. Напрыканцы інтэрв'ю Аляксей Венедыктаў уручыў кіраўніку дзяржавы падарункавыя шахматы ручной работы. А ў ягоным халадзільніку прыбавілася і беларускіх прадуктаў, бо з Мінска ён павёз падарункавы кошык ад Прэзідэнта.

**Варвара МАРОЗАВА.**